

# СЛІЗКІ
## Міхаіл Іванавіч
### (1.1.1944 — 18.11.2015)

Кампазітар, выканаўца, выкладчык, член Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці і міжнароднай камісіі па народных касцюмах, інструментах, песнях і танцах, заснавальнік адзінага ў Беларусі Музея гармоніка.

Любоў да музыкі Міхаілу Іванавічу прывілі яго бацька, Іван Міхайлавіч, які іграў на скрыпцы ў ансамблі гарманістаў, і маці, Марфа Сафронаўна, якая цудоўна спявала. Свой асабісты гармонік з'явіўся ў хлопчыка, калі яму было дзесяць гадоў. Але, на жаль, ён не захаваўся. Бацька прадаў інструмент, калі сын праходзіў службу ў арміі.

Аднойчы ў 1990-я гады Міхаіл Слізкі ўбачыў перадачу Генадзя Завалокіна «Грай, гармонь любімая», і ў яго ўзнікла жаданне стварыць сваю асабістую калекцыю гармонікаў, якія ў той час пачалі выцясняць электраклавішныя інструменты. Першымі экспанатамі сталі гармонь «Чайка» Шуйскай фабрыкі, а таксама інструмент, зроблены на заказ майстрам Міхаілам Гайдукевічам. З кожным годам інструментаў, якія набываліся на ўласныя сродкі, станавілася ўсё больш і больш. У 2003 годзе частка калекцыі атрымала пастаянную прапіску ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце культуры і мастацтваў на кафедры народна-інструментальнай творчасці факультэта музычнага мастацтва. Тады ж на базе калекцыі гармонікаў была створана вучэбна-творчая лабараторыя. Сёння ў музеі каля 100 экспанатаў. Большасць інструментаў зроблена вядомымі беларускімі майстрамі Мікалаем Хадыкам, Аляксандрам Красевым, Васілём Размысловічам, братамі Мазанікамі, Пятром Прыходзькам, шмат гармонікаў было выпушчана ў розныя гады Маладзечанскай фабрыкай музычных інструментаў, ёсць гармоні Жытомірскай, Шуйскай і Тульскай фабрык, ялецкі раяльны, еўрапейскі аўстрыйскага майстра Петэра Штахля, швейцарскі фірмы «Honner» і інш. Сярод найбольш цікавых экспанатаў — петраградская трохрадка венскага строю 1902 года, на якой іграла не адно пакаленне музыкантаў Рабізаў са станцыі Варапаева Віцебскай вобласці, гармонь майстра У. Сівова 1917 года, гармонікі нямецкі, перароблены на рускі строй, які разам з былым уладальнікам прайшоў усю вайну, а таксама саратаўскі са званочкамі, тульскі трохгалосы, які мае поўны храматычны рад і на якім можна іграць амаль што як на баяне. Акрамя гармоняў у музеі можна ўбачыць ударныя інструменты (бубны, тамбурыны), губныя гармонікі. Калі ў вучэбна-творчай лабараторыі праходзяць заняткі, кожны студэнт пры жаданні можа зайграць на любым інструменце.

1. Гармонік «Перамога» строю сі-бемоль мажор трохгалосы. Майстар П. Прыходзька. 1949.
*З прыватнай калекцыі М. Слізкага.*
Three-voiced harmonik «Peramoha» («Victory») of tuning system B Flat Major. Master P. Pryhodzka. 1949.
*From private collection of M. Slizki.*

2. Фрагмент гармоніка «Перамога» майстра П.Прыходзькі. 1949.
*З прыватнай калекцыі М. Слізкага.*
The detail of harmonik «Peramoha» («Victory») of master P. Pryhodzka. 1949.
*From private collection of M. Slizki.*

3. Гармонік петраградскі трохрадны венскага строю. Расія. 1902.
*З прыватнай калекцыі М. Слізкага.*
Three-row Petrograd harmonica of Viennese tuning system. Russia. 1902.
*From private collection of M. Slizki.*

4. Фрагмент гармоніка петраградскага трохраднага венскага строю. Расія. 1902.
*З прыватнай калекцыі М. Слізкага.*
The detail of three-row Petrograd harmonica of Viennese tuning system. Russia. 1902.
*From private collection of M. Slizki.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ